# ПАЛАЖЭННЕ
## аб IX адкрытым абласным фестывалі фальклорнага мастацтва “Радавод”

IX адкрыты абласны фестываль фальклорнага мастацтва “Радавод” праводзіцца згодна з календарам асноўных масавых мерапрыемстваў з навучэнцамі і студэнтамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў, якія рэалізуюць адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі на 2025 год, зацверджаным загадам ад 05.12.2024 № 994.

Мэта: стварэнне ўмоў дзеля падтрымкі, аховы і зберажэння самабытнай культуры Берасцейшчыны, папулярызацыі яе сярод дзяцей і моладзі, ажыццяўленне дыялогу культур паміж рознымі пакаленнямі і носьбітамі.

Задачы:

- прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем выхавання дзяцей і моладзі сродкамі традыцынай народнай творчасці;
- удасканаленне форм арганізацыі вольнага часу ў дзіцяча-маладзёжным асяроддзі;
- узаемаўзбагачэнне славянскіх культур праз зносіны дзяцей і моладзі;
- наладжванне прыгранічных сувязей паміж суседнімі краінамі;
- абмен ідэямі і ведамі, паляпшэнне ўзаемаразумення паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў і нацыянальнасцей праз фальклорнае мастацтва.

Заснавальнікі і арганізатары фестываля – галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”.

Фестываль праводзіцца раз праз два гады ў чатыры этапы. У фестывалі прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Брэсцкай вобласці, іншых абласцей Рэспублікі Беларусь і замежжа.

## СТРУКТУРА ФЕСТЫВАЛЮ

### *Першы этап:*

1. Фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі па сваёй мясцовасці з мэтай вывучэння традыцыйнай культуры рэгіёна, пераемнасці

і зберажэння самабытнай культуры Берасцейшчыны (чэрвень-снежань 2024 г.)

2. Абласны вебінар для педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў фальклорных калектываў, метадыстаў па тэме "Этнапедагогіка і традыцыі адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва "Радавод" у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі" (10 снежаня 2024 г.)

***Другі этап:***

1. Рэгіянальныя майстар-класы педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў фальклорных калектываў па тэме "Зберажэнне народнай традыцыйнай культуры праз беларускі мясцовы фальклор" (студзень-сакавік 2025г.);
2. IV абласны конкурс дзіцячых навукова-даследчых работ "Фальклорная спадчына" па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці (студзень – сакавік 2025 г.)
3. IV абласны конкурс відэакліпаў (народнай творчасці) "Берасцейская талакуха" творчай дзейнасці аматарскіх мастацкіх кадектываў (студзень – сакавік 2025 г.)
4. Адборачныя агляды дзіцячай народнай творчасці, святы фальклорнага мастацтва ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вобласці (люты 2025г.)
5. Раённыя (гарадскія) агляды дзіцячай народнай творчасці, святы фальклорнага мастацтва (сакавік 2025г.)

***Трэці этап:***

1. Занальныя агляды (Дадатак 3) дзіцячай народнай творчасці, фальклорных праграм і выстаў раёнаў (гарадоў) вобласці (сакавік-красавік 2025 г.)

Кожны раён (горад) паказвае фальклорную праграму не больш за 40 хвілін згодна намінацыям, у якую ўваходзяць лепшыя конкурсныя выступленні па выніках другога этапа:

**- конкурс "Фальклорная музыка"**

*намінацыя "Мясцовая фальклорная музыка"* (саліст, ансамбль), выканаўцы на старадаўніх адноўленных інструментах: жалейка, дуда, калесная ліра, гуслі, басэтля і інш. Працягласць твора да 4 хвілін мясцовых найгрышаў;

*намінацыя "Традыцыйная фальклорная музыка"* (саліст, ансамбль) выканаўцы на народных інструментах: дудка, цымбалы, скрыпка, гармонік, бубен, рубель, трашчотка, лыжкі, бубенчыкі, калатушка,

гліняная бразготка, свісцёлка, з вясковых прыладаў працы і іншых. Працягласць твора традыцыйных беларускіх найгрышаў да 4 хвілін.

**- конкурс “Фальклорныя спевы”**

*намінацыя “Абрадавыя спевы” (саліст, ансамбль, ансамбль з носьбітам)* спевы з каляндарна-абрадавага цыклу (вяснавога, летняга, восеньскага абраду, якія былі распаўсюджаныя ў рэгіене, згодна ўзроставай катэгорыі);

*намінацыя “Пазаабрадавая песня”(саліст, ансамбль, ансамбль з носьбітам)* бытавыя, сацыяльныя, гумарыстычна-жартоўныя і сатырычныя песні, прыпеўкі, якія бытавалі ў сваёй мясцовасці, згодна ўзроставай катэгорыі.

**- конкурс “Фальклорныя танцы”**

самабытныя карагоды каляндарнага цыклу, гульневыя традыцыйныя абрадавыя і пазаабрадавыя танцы свайго рэгёна;

**- конкурс “Фальклорны тэатр”**

*намінацыя “Мясцовы фальклорны абрад”*

звычаі і абрады традыцыйна-бытавой культуры сваёй мясцовасці,
абрад (урывак) летняга, вяснавога, восенскага цыклу працягласць да 6 хвілін;

*намінацыя “Народная паэтычная творчасць”*

народныя байкі, паданні, казкі, легенды сваёй мясцовасці працягласць не больш за 3 хвіліны;

*намінацыя “Народная тэатральная творчасць”*

“Тэатр батлейка”

пастаноўка (з жывым музычным афармленнем) працягласцю да 6 хвілін, з скрыняй мясцовых майстраў;

“Тэатр лялек”

пастаноўка на мясцовым музычным матэрыяле працягласць да 6 хвілін;

**- конкурс “Фальклорная гульня”**

самабытныя мясцовыя дзіцячыя абрадавыя і пазаабрадавыя гульні, музычныя лічылкі, забавы (“У гнілога бурака”, “Сею мак”, “Пастух”, “Полька праз тры” і інш.).

**- конкурс “Фальклорны касцюм”**

дэманстрацыя комплекснага адзення, абутку і аксесуараў, якія склаліся на працягу стагоддзяў для выкарыстання беларусамі ў штодзённым і святочным ужытку

*намінацыя “Святочны традыцыйны строй раёна”*

*намінацыя “Бытавы традыцыйны касцюм свайго раёна” (з элементамі прылады працы)*

**- конкурс лепшы канферанс фальклорнай праграмы**

матэрыял на беларускай мове (традыцыйнай і мясцовай гаворцы), сцэнічны вобраз, фальклорны рэканструяваны касцюм свайго рэгёна.

**Асобна ад 40 хвілін прадстаўляюцца матэрыялы**

на занальны агляд прадстаўляецца панарамнае фота, відэа экспазіцыі выставы “Фальварак майстроў”, экспанатаў, майстар-класаў, заяўка-спіс навучэнцаў і удзельнікаў:

- **заяўка на конкурс відэакліпаў** “Берасцейская талакуха” (Дадатак 5);
- **заяўка на конкурс дзіцячых навукова-даследчых работ** “Фальклорная спадчына” (Дадатак 6);
- **заяўка на конкурс танцавальных пар - выканаўцаў** фальклорных побытавых танцаў ад раёна (Дадатак 7)
- **заяўка на конкурс “Бабуліна кухня” (выстава-конкурс традыцыйных страў)** (дадатак 8)

*намінацыя “Абрадавая страва”*

тэма “Пасхальныя традыцыі”. У гэтай намінацыі неабходна адлюстраваць асабліваці пасхальных страў рэгіёну. Прадставіць непасрэдна стравы (пасхальная булка, фарбаваныя яйца “пісанкі”) і іх прэзентацыю.

*намінацыя-дэгустацыя “Бытавая страва”*

неабходна прадставіць **адну** страву, больш распаўсюджанную ў раёне (напрыклад “Грачаны хлеб”, “Спораўскі карасік”, “Жур” і інш.)

*намінацыя “Зборнік традыцыйных страў Берасцейшчыны”*

тэматычны матэрыял, які змяшчае апісанне традыцыйных страў свайго рэгіена (друкаваны і электронны варыянт);

- **заяўка на конкурс “Фальварак майстроў”** фальклорная выстава-конкурс. Прадстаўляюцца творы навучэнцаў, выкананыя на падставе традыцыйных рамястваў рэгіёну (дадатак 8).

Кожны раён паказвае выставу вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці тых напрамкаў, якія найбольш характэрны для рэгіёна.

*“Саломка”,*

*“Бондарства”*

*“Ганчарства”*

*“Ткацтва”*

*“Валянне валенак”*

*“Вышыўка” і інш.*

- **заяўка на конкурс “Майстар-клас” традыцыйных рамёстваў** (дадатак 8)

Кожны раён (горад) абавязкова прадстаўляе 1-2 майстар-класы на пляцоўцы “Фальварак майстроў”.

Майстар-класы могут быць з удзелам навучэнцаў, навучэнцаў і педагогаў, **навучэнцаў з носьбітам** (народных майстроў свайго

рэгіёну: ганчарства, саломапляценне, ткацтва, вышыўка, роспіс па шклу, валянне валёнкаў, пляценне кошыкаў і інш.).

- **заяўка на конкурс "Музейны куток"** (дадатак 8)

Намінацыя прадстаўляе сабой ***тэматычную*** выставу аўтэнтычных рэчаў характэрных для свайго рэгіёна (выстава побытавых рэчаў, выстава абсталявання для палявых работ, выстава прылад для ткацтва, фрагмент інтэр'еру сялянсай хаты і інш.), размешчаную на асобнай пляцоўцы. Прэзентацыя выставы можа суправаджацца песнямі, забавамі альбо абрадам, у якім дзейнічае прэзентуемыя прылады працы. Асобна на заключныхмерапрыемствах будзе будзе праводзіцца абласны конкурс юных майстроў праект "Усё у тваіх руках"

- **заяўка на конкурс юных майстроў** (дадатак 8)

*падаецца за 20 дзён да даты правядзеняя заключных мерапрыемстваў*
ад кожнага раёна запрашаецца 2 навучэнца для ўдзелу ў конкурсе.

Намінацыі конкурса:

- традыцыйная тэкстыльная цацка
- традыцыйная цацка з прыроднага матэрыялу (салома, дрэва, талаш і інш.)
- традыцыйная гліняная цацка

Узроставыя катэгорыі:

- 9-12 гадоў
- 13-16 гадоў

Працягласць выканання работы – 3 гадзіны.

## ***Чацвёрты этап:***

Заключныя імпрэзы IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод" (16-17 мая 2025 г., Брэсцкая вобласць):

1. Абласная дзіцячая навукова-практычная канферэнцыя "Папулярызацыя традыцыйнай народнай культуры і шляхі зберажэння мясцовых традыцый" па выніках IV абласнога конкурсу дзіцячых навукова-даследчых работ "Фальклорная спадчына", IV адкрытага абласнога конкурса відэакліпаў "Берасцейская талакуха". Прэзентацыя зборніка "Паводле бабуліных успамінаў".
2. Абрадавае шэсце ўдзельнікаў фальклорных калектываў вобласці;

3. Святочная выстава-конкурс “Фальварак майстроў”; майстар-класы юных майстроў народных промыслаў; выстава-конкурс “Бабуліна кухня”(асобная пляцоўка);
4. Гульневы падворак;
5. Фальклорныя пляцоўкі “Асаблівасці традыцыйнага дзіцячага фальклору Заходняга Палесся” ў рамках Рэспубліканскіх VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў;
6. Фінал конкурсу танцавальных пар-выканаўцаў побытавых танцаў;
7. Выступленне гасцевых калектываў з замежжа і Рэспублікі Беларусь;
8. Конкурс юных майстроў;
9. Конкурс выставы аўтэнтычных рэчаў “Музейны куток” (асобная пляцоўка);
10. Гала-канцэрт фіналістаў абласнога агляду-конкурсу;
11. Урачыстае узнагароджванне пераможаў фестывалю лепшай фальклорнай праграмы раёна і асобных выканаўцаў, калектываў, майстроў;
12. Этнадыскатэка для гасцей і ўдзельнікаў фестывалю з вядучымі ўзорнымі калектывамі вобласці;
13. Круглы стол па тэме: “Захоўванне і аднаўленне фальклорных здабыткаў у аматарскіх калектывах сістэмы устаноў адукацыі для педагагічных работнікаў, вядучых спецыялістаў фальклорнага накірунка, экспертнага журы фестываля”.

Умовы адбору удзельнікаў

Раённы (гарадскі) аргкамітэт фарміруе журы, у склад якога ўваходзяць вядомыя ў сваіх рэгіёнах фальклdensarysty і этнографы, практыкі музычнага, песеннага, інструментальнага, танцавальнага жанраў, прыкладных відаў народнага мастацтва. Аргкамітэт па выніках раённага этапа высылае дакументы на ўдзел у трэцім этапе, падпісаныя старшынёй журы і членамі аргкамітэта, не меньш за 10 дзён да вызначанай даты згодна з графікам (Дадатак 3) на адрас: 224020, г.Брэст, вул. Маскоўская, 123; па электроннай пошце cmt@brest.by :

- заяўка-праграма з спасылкамі на відэазапіс; заяўка-прэзентацыя выставы з відэазапісам ад раёна на ўдзел у трэцім этапе* (назвы і нумары відэа павінны адпавядаць нумарацыі ў заяўцы, Дадатак 4);

- аналітычную справаздачу аб правядзенні першага і другога этапаў фестывалю, падпісаную членамі аргкамітэта;

- пратакол пасяджэння журы другога этапа агляду.

*Фальклорныя калектывы, якія маюць найменне “ўзорны”, абавязкова прымаюць удзел у фальклорных праграмах на занальных аглядах.

Па выніках трэцяга этапа журы запрашае на заключныя імпрэзы фіналістаў фестываля, дзе экспертным журы, будуць вызначаны і ўзнагароджаны пераможцы IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”.

Праграма ўдзельнікаў заключных імпрэзаў фестывалю, яе працягласць будзе абумоўлена ў асобным пісьме-запрашэнні па выніках трэцяга этапа. Калектывы і выканаўцы прымаюць удзел у відовішчах, шэсці, рабоце канцэртных пляцовак. Удзельнікі фестывалю павінны быць апрануты ў касцюмы, якія адпавядаюць традыцыям сваёй мясцовасці (рэканструяваныя рэгіянальныя касцюмы). Галаўны ўбор, прычоска, абутак павінны адпавядаць традыцыйнаму строю касцюма.

Рэпертуар музычных інструментальных ансамбляў складаецца з адноўленых старадаўніх мясцовых найгрышаў.

Праграма выступлення ўдзельнікаў фестывалю павінна быць скіравана на раскрыццё фальклорных традыцый менавіта сваёй мясцовасці. Не дазваляецца выкананне аўтарскіх твораў.

Удзельнікі заключных імпрэзаў фестывалю павінны мець:

1. Штандарт калектыву і раёна з аздабленнем у традыцыйным стыле;
2. Ілюстраваную рэкламна-інфармацыйную выставу (банеры, ці стэнды), якая адлюстроўвае асноўныя напрамкі дзейнасці ўстаноў адукацыі па выхаванню дзяцей і моладзі на падставе фальклорнай спадчыны, тэхнічна зручную для экспанавання ў прыродных умовах і закрытых памяшканнях.

Інфармацыя аб правядзенні фестывалю размешчана на сайце www.cmt.brest.by, пытанні, падрабязнасці - па тэлефоне: 8 (162) 23 60 73 – загадчык аддзела мастацкай творчасці УА “БДАЦМТ” Коўш Таццяна Сяргееўна, метадыст аддзела мастацкай творчасці УА “БДАЦМТ” Брыч Віялета Крыштофаўна. Па пытаннях выставы і пляцовак: “Фальварак майстроў”, “Музейны куток”, “Бабуліна кухня” і конкурсу юных майстроў – загадчык аддзела выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці Бабіч Святлана Яўгенаўна. Тэлефон для справак: 8 (162) 23 60 85.

Заахвочванне ўдзельнікаў

Спецыяльнымі дыпломамі і прызамі аргкамітэта фестывалю (Дадатак 1) на падставе рашэння абласнога журы (Дадатак 2) па выніках занальных аглядаў узнагароджваюцца пераможцы мэтавых конкурсаў:

- конкурс фальклорнай музыкі (мясцовай і традыцыйнай);
- конкурс фальклорных спеваў;
- конкурс фальклорных танцавальных калектываў;
– конкурс танцавальных пар – выканаўцаў побытавых танцаў;
- конкурс фальклорных тэатраў, батлеек;
- конкурс фальклорнай гульні;
- конкурс лепшы вядучы фальклорнай праграмы;
- конкурс фальклорнага касцюма;
- конкурс традыцыйных рамёстваў майстар-класаў;
- конкурс фальклорнай кухні "Бабуліна кухня";
- конкурс відэаклiпаў "Берасцейская талакуха";
- конкурс юных майстроў;
- конкурс дзiцячых навукова-даследчых работ "Фальклорная спадчына";
- конкурс выставы аўтэнтычных рэчаў "Музейны куток".

Удзельнікі заключных імпрэзаў абласнога фестывалю "Радавод" на падставе рашэння экспертнага журы ўзнагароджваюцца дыпломамі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама I, II, Ш ступені, Гран-пры, спецыяльнымі прызамі і памятнымі сувенірамі аргкамітэта ў намінацыях:

"Лепшая фальклорная праграма раёна";

"Лепшы фальклорны калектыў";

"Лепшая фальклорная выстава раёна "Фальварак майстроў" .

Фінансаванне

Галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама забяспечвае фінансаванне:
- харчаванне дзiцячых дэлегацый на заключных імпрэзах фестывалю;
- аплату работы экспертнага журы заключных імпрэзаў;
- аплату друкаванай прадукцыі (буклеты, вымпелы, календары, дыпломы з сімволікай фестывалю, зборнік дзіцячых навукова-даследчых работ "Паводле бабуліных успамінаў", інфармацыйныя банеры, афіша з праграмай);
- дыпломамі, пахвальнымі водгукамі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.

Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці" забяспечвае вымпеламі і кубкамі фестывалю.

Транспартныя і камандзіровачныя расходы кіраўнікоў калектываў, членаў журы, педагогаў, дарослых удзельнікаў фестывалю за кошт камандзіруючых арганізацый.

Фінансаванне заключных імпрэзаў фестывалю можа таксама ажыццяўляцца за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дадатак 1

АРГКАМІТЭТ

| | |
|---|---|
| І.А. Папова | намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама; |

| | |
|---|---|
| А.Ў. Сенькевіч | начальнік упраўлення па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце галоўнага упраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама; |
| В.С. Іваноў | дырэктар УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| А.А. Клунін | наместнік дырэктара УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”, дырэктар фестывалю. |

Дадатак 2

Склад абласнога журы

| | |
|---|---|
| Клунін А.А. | наместнік дырэктара УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”, дырэктар фестывалю; |

| | |
|---|---|
| Коўш Т.С. | загадчык аддзела мастацкай творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Куцень І.С. | загадчык аддзела арганізацыйна-творчай работы УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Бабіч С.Я. | загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Брыч В.К. | метадыст аддзела мастацкай творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Панасюк А.М. | метадыст аддзела мастацкай творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Султанаў В.У. | метадыст аддзела мастацкай творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Сімаковіч А.А. | метадыст аддзела выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”; |
| Пішчук К.В. | метадыст аддзела выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”. |

Дадатак 3

Графік занальных аглядаў
ІХ абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”
(працяг фальклорнай праграмы раёна – 40 хвілін)

15 сакавіка 2025 г. – Пінская зона

*(г.Пінск, вул. Ільіча, 13, ДУА “Гімназія № 2 г. Пінска”)* пачатак у 11.00

| | |
|---|---|
| 1. г. Пінск | 11.00-11.40 |
| 2. Пінскі раён | 11.50-12.30 |
| 3. Столінскі раён | 12.40-13.20 |
| 4. Лунінецкі раён | 14.00-14.40 |
| 5. Іванаўскі раён | 14.50-15.30 |
| 6. Драгічынскі раён | 15.40-16.20 |

16 сакавіка 2025 г. – Баранавіцкая зона
*(г.Баранавічы, вул. Савецкая, 136, ДУА “Палац дзіцячай творчасці г. Баранавічы”)* пачатак у 10.00

| | |
|---|---|
| 1. г.Баранавічы | 10.00-10.40 |
| 2. Баранавіцкі раён | 10.50-11.30 |
| 3. Бярозаўскі раён | 11.40-12.20 |
| 4. Ганцавіцкі раён | 13.00-13.40 |
| 5. Івацэвіцкі раён | 13.50-14.30 |
| 6. Ляхавіцкі раён | 14.40-15.20 |

29 сакавіка 2025 г. – Брэсцкая зона
*(г. Брэст, вул. Маскоўская, 123, УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”)*
пачатак у 10.00

| | |
|---|---|
| 1. Камянецкі раён | 10.00-10.40 |
| 2. Пружанскі раён | 10.50-11.30 |
| 3. Маларыцкі раён | 11.40-12.20 |
| 4. Кобрынскі раён | 12.30-13.10 |
| 5. Жабінкаўскі раён | 13.50-14.30 |
| 6. Брэсцкі раён | 14.40-15.20 |
| 7. г. Брэст | 15.30-16.10 |
| 8. УА “БДАЦМТ” | 16.20-17.00 |

*па выніках раённага агляду кожны раён рыхтуе відэа праграму (ці зборнік асобных выступленняў) пераможцаў раённага этапу агульнай працягласцю не больш за 40 хвілін. Відэа прэзентацыі выстаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, майстар-класаў юных майстроў і прэзентацый “Бабуліна кухня” прадстаўляюцца асобна.

Дадатак 4

ЗАЯЎКА – ПРАГРАМА

Раён______________________________________________________________

| № | назва нумара (з указаннем носьбіта, з датай нараджэння, жыхарства вескі, раёна) | выканаўца (прозвішча, імя ці назва калектыву) установа, педагог, тэлефон | колькасць удзельнікаў (хлопцаў, дзяўчын) | узрост | працягласць выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | |

Тэлефоны для сувязі

______________________________________________________________

e-mail

______________________________________________________________

Адказны за мерапрыемства______________________________________

Подпіс адказнага

Пячатка

Дадатак 5

**IV абласны канкурс відэакліпаў**
**"Берасцейская талакуха"**

па выніках творчай дзейнасці фальклорных калектываў у рамках
IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”

*Мэта:*
садзейнічае павышэнню творчага ўзроўню навучэнцаў праз выразныя сродкі відэамастацтва, выхаванню нацыянальнай і грамадскай свядомасці.

*Задачы:*
- прапаганда нацыянальных, мясцовых фальклорных традыцый;
- прэзентацыя фальклорных калектываў сістэмы адукацыі Брэсцкай вобласці;
- выхаванне любові да культурнай спадчыны малой Радзімы.

*Арганізатары:*
галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзежнай творчасці”.

*Тэрмін правядзення:*
сакавік - красавік 2025 года.

*Удзельнікі:*
аматарскія аб’яднанні, навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Брэсцкай вобласці.

*Асноўныя крытэрыі адзнакі:*
- выкарыстанне аўтэнтычнага фальклорнага матэрыяла;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- артыстызм, музычнасць, выразнасць;
- наяўнасць носьбіта;
- касцюмы і рэквізіт;
- рэжысёрска-пастановачная работа.

*Намінацыі:*
- відэакліп на аснове аўтэнтычнага фальклору з носьбітам ( у прыродным асяроддзі: поле, лес, ля возера і інш.);
- відэакліп на аснове традыцыйна-абрадавай дзейнасці (абрады, вячоркі);
- відэакліп на аснове фальклорнага матэрыла у сучаснай (эстраднай) аранжыроўцы.

*Патрабаванні:*

- відэакліп здымаецца любымі тэхнічнымі сродкамі на падставе фальклорнага матэрыялу: на песню, танец, тэатр моды, гульню, забаўлянку, музычны твор;
- відэакліп, саліста павінен быць працягласцю не большл за 5 хвілін, з'яўляецца вынікам яго творчай дзейнасці;
- відэакліп, фальклорнага калектыву павінен быць працягласцю не больш за 5 хвілін, з'яўляецца вынікам яго творчай дзейнасці;
- павінен мець інфармацыйную застаўку з назвай твора і аўтара.

Відэакліп дасылаецца ва ўстанову адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці " (аддзел мастацкай творчасці) на электронную пошту cmt@brest.by з паметкай "На конкурс відэакліпаў "Берасцейская талакуха" у выглядзе спасылкі на Яндэкс-дыск )

| | Заяўка на ўдзел<br>IV абласнога конкурса відэакліпаў<br>"Берасцейская талакуха" | | | |
|---|---|---|---|---|
| № п/п | Назва кліпа | Прозвішча, імя навучэнца/ Назва аб'яднання/ Установа адукацыі | Прозвішча асабістага імя, імя па бацьку педагога, кантактны тэлефон | спасылка на відэаматэрыял |

Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння пераможцаў фарміруецца журы, склад якога вызначае арганізацыйны камітэт IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод".

Рашэннем журы вызначаюцца лепшыя відэакліпы, якія будуць узнагароджаны дыпломамі I, II, III ступені спецыяльнымі дыпломамі фестывалю і дыпломамі I, II, III ступені галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, творы пераможцаў увайдуць у зборнік відэакліпаў конкурсу "Берасцейская талакуха" і будуць прэзентаваны на IX адкрытым абласным фестывалі фальклорнага мастацтва "Радавод" ў маі 2025 года. Магчымы дадатковыя намінацыі: "Лепшы кліп", "Лепшы сучасны падыход да фальклорнага матэрыялу", "Лепшы мантаж", "Лепшая экспедыцыя".

Дадатак 6

**IV абласныконкурс дзіцячых навукова-даследчых работ "Фальклорная спадчына"**

па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці ў рамках IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод"

*Мэта:*

канкурс праводзіцца з мэтай падтрымкі творчасці таленавітых дзяцей і моладзі, выхавання нацыянальнай і грамадскай свядомасці, патрыятызму, зацікаўленасці творчай моладзі ў грамадска-карыснай дзейнасці.

*Задачы:*

- выхаванне любові да роднай культуры, фарміраванне каштоўных арыенціраў;
- зберажэнне мясцовых традыцый і стварэнне ўмоў па іх пераемнасці;
- выхаванне патрыятызму, умацаванне ў грамадстве высокіх маральных і эстэтычных ідэалаў;
- прапаганда нацыянальных культурных каштоўнасцей беларускага народа;
- развіццё навыкаў стварэння навукова-даследчых работ.

*Арганізатары конкурсу:*

галоўнае ўпраўленне па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці".

Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размешчана на сайце www.cmt.brest.by, падрабязнасці па тэлефоне: 8 (162) 23 60 73 – загадчык аддзела мастацкай творчасці УА "БДАЦМТ" Коўш Таццяна Сяргееўна, метадыст аддзела мастацкай творчасці УА "БДАЦМТ" Брыч Віялета Крыштофаўна.

*Падача конкурсных работ:*

конкурсная работа дасылаецца ў УА "БДАЦМТ" у электронным выглядзе з абавязковым надпісам "На абласны конкурс дзіцячых навукова-даследчых работ "Фальклорная спадчына", у камп'ютарным наборы (не больш за 6 старонак, інтэрвал – 1,0; тэкставы рэдактар, кегель – 15; шрыфт –Times New Roman) у перыяд з 1 лістапада 2024 года да сакавіка 2025 года на электронную пошту cmt@brest.by аддзел

мастацкай творчасці. Для ўдзелу ў конкурсе дасылаецца заяўка з наступнымі звесткамі:

- прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку;
- узрост;
- фота аўтара;
- прозвішча, імя, імя па бацьку педагога;
- установа адукацыі;
- адрас установы адукацыі;
- нумары стацыянарнага /мабільнага тэлефонаў;
- адрас электроннай пошты.

*Работы, якія не адпавядаюць дадзеным умовам або паступілі пазней вызначаных тэрмінаў, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

*Удзельнікі конкурсу:*

навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Брэсцкай вобласці.

*Патрабаванні:*

навукова-даследчая работа ўключае ў сябе даследаванне і вывучэнне навучэнцамі фальклорнай спадчыны свайго раёна *(апісанне самабытных абрадаў, звычаяў, абрадава-святочнага касцюма, традыцыйнага строя, гісторыка-бытавога касцюма, мясцовых абрадава-святочных гульняў, карагодаў, танцаў, песень)* харэаграфічнага, музычнага, народна-песеннага і народна-інструментальнага фальклорнага мастацтва, празаічных жанраў, традыцыйных рамёстваў і іншай фальклорнай спадчыны свайго рэгіёна.

*Навучэнцы устаноў адукацыі г. Брэста даследваюць спадчыну Брэсцкага раёна, г. Баранавічы – Баранавіцкага раёна, г. Пінска – Пінскага раёна.

*Асноўнымі крытэрыямі адзнакі конкурсных работ з’яўляюцца:*

- адпаведнасць прадстаўленай конкурснай работы тэме конкурсу;
- змест аўтэнтычнага матэрыялу;
- паэтапнае даследаванне тэмы і выснова;
- фотаздымкі, відэазапісы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі свайму рэгіёну.

Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння пераможцаў фарміруецца журы, склад якога вызначаюць арганізацыйны камітэт IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”.

Рашэннем журы вызначаюцца лепшыя конкурсныя работы, аўтары якіх прымуць удзел як дакладчыкі ў абласной дзіцячай навукова-практычнай канферэнцыі, дзе будуць узнагароджаны дыпломамі I, II, III ступені галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама (красавік-май 2025 года). Лепшыя конкурсныя работы будуць надрукаваны ў зборніку “Паводле бабуліных успамінаў”.

Дадатак 7

**Конкурс танцавальных пар –**
**выканаўцаў фальклорных побытавых танцаў**
па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці ў рамках IX адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод"

ПРАГРАМА ПРАВЯДЗЕННЯ

*Першая ўзроставая група (2 – 4 клас)*
- Лявоніха
- Лысы (Карапет)
- Базар
- Падэспан

*Другая ўзроставая група (5 – 6 класы)*

Застаюцца танцы першай узроставай групы, да іх далучаюцца наступныя танцы:
- Ва саду лі
- Мясцовая полька
- Кракавяк
- Яблычка

*Трэцяя ўзроставая група (7 -8 класы)*

Застаюцца танцы першай і другой узроставай групы, да іх далучаюцца наступныя танцы:

- Вальс
- Бабачка
- Ойра
- Каробачка
- Мясцовая полька
- Рэчанька (Нарэчанька)

*Чацвертая ўзроставая група ( 9 – 11класы)*

Застаюцца танцы першай, другой і трэцяй узроставых груп , да іх далучаюцца наступныя танцы:

- Мікіта (Таўкачыкі)
- Какетка
- Каханачка
- Субота
- Мясцовая полька (с прыпеўкамі)

**Спіс удзельнікаў:**

*заяўка на конкурс танцавальных пар –*
*выканаўцаў фальклорных побытавых танцаў у рамках*
*IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”*

| № п/п | прозвішча, асабістае імя удзельніка | | установа адукацыі | аб’яднанне па інтарэсам | прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | Узростcovая група |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | ***партнер*** | | | | | |
| | **партнерка** | | | | | |

*Дадатак 8*

**Спіс удзельнікаў:**

*заяўка на ўдзел у конкурсе юных майстроў "Усё ў тваіх руках"*
*у рамках IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод"*

| | |
|---|---|
| Назва ўстановы адукацыі | |
| Прозвішча, імя ўдзельніка | |
| Назва аб'яднання па інтарэсах | |
| Намінацыя | |
| Узроставая катэгорыя | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (поўнае), тэлефон для сувязі | |

*заяўка на ўдзел у прэзентацыі выставы "Фальварак майстроў"*
*у рамках IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва "Радавод"*

| № п/п | Назва ўстановы адукацыі | Назва аб'яднання па інтарэсах | Назва выставы (фрагменту выставы) | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (поўнае), тэлефон для сувязі |
|---|---|---|---|---|

*заяўка на ўдзел у конкурсе "Майстар-класаў*

*традыцыйных раместваў“*
*у рамках IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”*

| № п/п | Назва майстар-класа | Прозвішча, імя ўдзельнікаў (вучні, носьбіт, пры наяўнасці) | Назва аб’яднання па інтарэсах | Назва ўстановы адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (поўнае), тэлефон для сувязі |
|---|---|---|---|---|---|

*заяўка на ўдзел у канкурсе “Бабуліна кухня”*
*у рамках IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”*

| № п/п | намінацыя | Назва прэзентацыі | Прозвішча, імя ўдзельнікаў (вучні, носьбіт, пры наяўнасці) | Назва аб’яднання па інтарэсах | Назва ўстановы адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога (поўнае), тэлефон для сувязі |
|---|---|---|---|---|---|---|

*заяўка на ўдзел у конкурсе “Музейны куток” у рамках IX абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”*

| № п/п | Назва выставы | Назва аб’яднання па інтарэсах | Назва ўстановы адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку адказнага педагога (поўнае), тэлефон для сувязі |
|---|---|---|---|---|